*УДК 378.4*

# МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ МУЗЕЙНА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ БУДУЧЫХ ПЕДАГОГАЎ

**С. Д. Грынько**

*УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»,*
*вул. Э. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна, Беларусь, s.grinko@inbox.ru*

У артыкуле асвятляецца праблема выкарыстання музейна-педагагічнай дзейнасці пры падрыхтоўцы будучых педагогаў, якая рэалізуецца за кошт комплекснага спалучэння традыцыйных і інтэрактыўных метадаў са спасобамі ўзаемадзеяння з наведвальнікамі музейнага педагога. Дадзенае метадычнае забеспячэнне арганізацыі супрацоўніцтва з музеем у адукацыйным працэсе забяспечвае фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей з прыярытэтам іх дзейнасці на агульначалавечыя каштоўнасці, а таксама развівае творчы патэнцыял навучэнцаў.

***Ключавыя словы:*** музейна-педагагічная дзейнасць; будучыя педагогі; адукацыйная сістэма; педагагічны працэс; музей.

# METHODOLOGICAL SUPPORT OF MUSEUM-PEDAGOGICAL ACTIVITIE IN THE PREPARATION OF FUTURE TEACHERS

**S. D. Hrynko**

*Yanka Kupala State University of Grodno,*
*E. Ozheshko St., 22, 230023, Grodno, Belarus, s.grinko@inbox.ru*

The article covers the problem of using museum-pedagogical activities in the training of future teachers, which is implemented through a comprehensive combination of traditional and interactive methods with ways of interaction with visitors to the museum teacher. This methodological support for the organization of cooperation with the museum in the educational process provides the formation of an active civic position in students of pedagogical specialties with the priority of their activities on universal values, as well as develops the creative potential of students.

***Key words:*** museum-pedagogical activity; future teachers; educational system; pedagogical process; museum.

Сучаснаму чалавеку вельмі складана ўявіць сваё жыццё без ведаў, без атрымання адукацыі, каштоўнасць якой узрастае і цесным чынам звязана з пераадоленнем крызісных з’яў у грамадстве, якія нярэдка носяць глабальны харaактар. Вельмі часта, характарызуючы складанасці ў сучасным свеце, навукоўцы ўжываюць паняцце VUCA-рэальнасць, якое вызначаецца чатырма крытэрыямі: V – volatility – нестабільнасць, зменлівасць, U – uncertainty – нявызначанасць, няяснасць. C – complexity – складанасць. A – ambiguity – неадназначнасць, двухсэнсоўнасць. Асоба, якая дасягае поспеху ў такіх неадназначных і складаных рэаліях свайго быцця павінна валодаць якасцямі свядомага і

актыўнага грамадзяніна-лідара, што таксама складаюцца ў акронім VUCA: **V**ision (бачанне), **U**nderstanding (разуменне), **C**larity (яснасць), **A**gility (хуткасць) [1, с. 87–88]. Чалавек, які гарманічна суіснуе з сучаснымі рэаліямі навакольнага свету, павінен быць камунікабельным, талерантным і таварыскім у адносінах да іншых людзей, валявым і крэатыўным, здольным да аналізу сітуацыі і сваіх учынкаў.

Сістэма адукацыі ў XXI стагоддзі таксама характарызуецца нестабільнасцю і зменлівасцю, бо залежыць ад мадэрнізацыі сацыяльнай і эканамічнай сфер дзейнасці чалавека. Задача педагагічнага працэсу ў сучасных умовах заключаецца не столькі ў трансляцыі і набыцці ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцам, колькі ў яго асобасным развіцці, фарміраванні актыўнай грамадзянскай пазіцыі навучэнцаў. У час актыўных змен у працэсе навучання і выхавання моладзі актуальнымі з’яўляюцца погляды рускага педагога і філосафа першай паловы XX стагоддзя С. І. Гесэна, які, звязваючы мэты адукацыі з жыццядзейнасцю грамадства, сцвярджаў, што пераадоленне крызісу «крытычнай эпохі» вырашаецца шляхам далучэння асобы да найвышэйшых культурных каштоўнасцей праз адукацыю [2].

У Рэспубліцы Беларусь культурныя традыцыі беларускага народа, дасягненні сусветнай культуры вызначаюцца ў якасці асновы адукацыйнага працэсу [3, с. 107], што падразумявае ўключэнне ў змест выхавання асобы агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей. Сучасная сістэма адукацыі павінна быць арыентавана на прынцыпы гуманізацыі і гуманітарызацыі, дыверсіфікацыі і індывідуалізацыі, улічваючы ступень развіцця інфармацыйных тэхналогій і неперарыўнасць адукацыйнага працэсу ў грамадстве XXI стагоддзя [4, с. 3–4]. Патрабаванні да працы педагога ў такіх умовах узрастаюць. Гэта назіраецца як у перадачы неабходных ведаў для жыцця ў соцыуме, так і ў выхаванні маральнасці і культуры паводзін у пакалення, якому жыць і працаваць у будучым. Парадаксальнасць гэтай педагагічнай функцыі ў тым, што настаўнік новай фармацыі сам належыць яшчэ да старога свету і ў ва ўмовах нестабільнасці і складанасці, няяснасці і неадназначнасці сацыяльных рэалій не гатовы «весці» свайго выхаванца па жыцці. Да таго ж такая сітуацыя з выкананнем сваёй спрадвечнай ролі спалучаецца з падзеннем прэстыжу прафесіі і матэрыяльнымі цяжкасцямі. Тым не менш, пералік патрабаванняў да сучаснага педагога досыць вялікі і змяшчае ў сабе шырокі спектр асобасных характарыстык:

- высокая грамадзянская і маральная пазіцыя;
- любоў да дзяцей, вытрымка і пачуццё гумару;

- сапраўдная інтэлігентнасць;
- інавацыйны стыль навукова-педагагічнага мыслення;
- патрэбнасць у пастаяннай самаадукацыі і камп'ютарная граматнасць;
- фізічнае і псіхічнае здароўе;
- педагагічнае майстэрства.

На наш погляд, музей – той сацыяльны інстытут, сродкі якога неабходна выкарыстоўваць у навучальным працэсе са студэнтамі педагагічных спецыяльнасцей як для забеспячэння культуралагічнага грунту ў іх падрыхтоўцы, так і для асобаснага фарміравання будучых спецыялістаў. Адукацыйны патэнцыял гэтай установы акрэслены ўжо ў самім азначэнні, дзе ўказваецца асноўная функцыя музея – актуалізацыя і трансляцыя наступным пакаленням найбольш каштоўнай часткі культурнай і прыроднай спадчыны [5]. Нягледзячы на тое, што ў дачыненні да «храма музаў» ужываецца вызначэнне «магілкі мастацтва» (Альфонс дэ Ламарцін (1790–1869)), па словах рускага філосафа М. Ф. Фёдарава (1829–1903), для музея не існуе таго, што ўваскрэсіць і ажывіць немагчыма, таму ён можа і павінен вяртаць жыццё [6, с. 5]. За кошт гэтай унікальнай уласцівасці музея ўзнаўляць культурныя набыткі грамадства адукацыйны працэс набывае зусім іншыя характарыстыкі. Б. А. Сталяроў сцвярджае, што ў гэтай установе педагагічны працэс ажыццяўляецца праз каштоўнасныя адносіны асобы і пашырэнне пачуццёвага вопыту ў працэсе камунікацыі з помнікам культуры [7, с. 87]. Пранікненне інфармацыйных тэхналогій у сферу дзейнасці музея, пашырэнне яго функцый на іншыя арганізацыі і з'яўленне ўстаноў музейнага тыпу (музей-тэатр, музей-майстэрня, музей-аптэка, музей-клуб і г. д.) узмацняе інфармацыйны і эмацыянальны ўплыў на асобу наведвальніка.

Перавагі выкарыстання музейна-педагагічнай дзейнасці ў падрыхтоўцы педагогаў, на наш погляд, заключаюцца ў наступным:

- цэласнае ўспрыманне гісторыі народа, краю;
- фарміраванне светапогляду асобы;
- дэтальнае засваенне інфармацыі з апорай на зрокавае ўспрыманне;
- актуалізацыя ролі асобы ў гісторыі грамадства;
- насычэнне працэсу пазнання яркімі станоўчымі эмоцыямі;
- усведамленне гістарычнай і эстэтычнай вартасці прадметаў культуры;
- выхаванне агульнай культуры паводзін, зносін.

У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы маецца практыка падрыхтоўкі студэнтаў спецыяльнасцей «Дашкольная адукацыя», «Пачатковая адукацыя» сродкамі музейна-педагагічнай дзейнасці. Так, у межах вучэбнай дысцыпліны «Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі» праводзіцца праца ў наступных напрамках:

1) вывучэнне тэарэтычных і метадалагічных асноў тэхналогіі музейнай педагогікі;

2) рэалізацыя прынцыпу музеефікацыі адукацыі ў педагагічным працэсе (засяроджваецца ўвага на гістарычным аспекце матэрыялу, які вывучаецца, на яго культурнай і эстэтычнай значымасці, фарміруюцца каштоўнасныя адносіны да ўласнага жыцця, блізкіх людзей і навакольнага асяроддзя);

3) арганізацыя экскурсій у музей (установа ў горадзе ці школе);

4) напісанне творчых работ на аснове наведванняў;

5) выкананне заданняў, распрацоўка канспектаў урокаў на аснове інфармацыйна-даведачных матэрыялаў з сайтаў музеяў.

Выкарыстанне сродкаў музея ў адукацыйным працэсе будучых настаўнікаў ажыццяўляецца за кошт інтэграцыі розных спосабаў педагагічнага ўзаемадзеяння.

Пры выкладанні дысцыпліны «Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі» ўзрастае запатрабаванасць у **традыцыйных** (гутарка, аповед, дыялог, тлумачэнне, дэманстрацыя, ілюстрацыя, практычная работа, інш.) і **інтэрактыўных метадах**. Да інтэрактыўных метадаў (па С. С. Кашлеву) адносяцца: *метады стварэння спрыяльнай атмасферы і арганізацыі камунікацыі (узаемадзеяння)* («Завяршы фразу», «Камплімент», «Падары кветку»); *метады арганізацыі абмену дзейнасцю* («Майстэрня будучага», «Інтэрв’ю», «Круглы стол»); *метады арганізацыі сэнсатворчасці* («Асацыяцыі», «Хвіліна гаварэння», «Алітарацыя паняцця»); *метады арганізацыі мыслядзейнасці* («Чатыры куты», «Выбар», «Тузін пытанняў», «Змена суразмоўцы»); *метады арганізацыі рэфлексійнай дзейнасці* («Рэфлексійнае кола», «Міні-сачыненне», «Ланцужок пажаданняў»). У працэсе навучання выкарыстоўваюцца **метады музейнай педагогікі**: інфармацыйныя, рэпрадуктыўныя, прадуктыўныя, даследчыя, «пагружэнне» ў гістарычнае асяроддзе, ролевае «пражыванне» гістарычных падзей, рэканструкцыя, параўнальныя аналогіі. Прыклад такога комплекснага спалучэння метадаў пры вывучэнні тэмы «Тэхналогія педагагічных майстэрняў» паказаны на схеме 1.




Схема 1 – Музейна-педагагічная дзейнасць пры выкладанні дысцыпліны «Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі»

Такім чынам, з дапамогай комплекснага метадычнага забеспячэння музейна-педагагічнай дзейнасці пры падрыхтоўцы будучых педагогаў ажыццяўляецца ўплыў на іх асобу: **бачанне** і **разуменне** сваёй сацыяльнай ролі і пасяховасці ў грамадстве (**V**ision, **U**nderstanding), **яснае** разуменне сучасных рэалій праз іх гістарычны аналіз, прадастаўленне магчымасці быць **гібкімі** і мадэляваць свае паводзіны ў розных напрамках, праяўляючы свой прыродны творчы патэнцыял (**C**larity. **A**gility). Гэта і ёсць адзін з магчымых адказаў VUCA-раэльнасці і яго наступствам у сістэме адукацыі.

Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Костырева Е. В.* Новый мир – новые образовательные технологии // Педагогическая наука и практика. 2017. № 4 (18). С. 87–91.

2. Кодекс Республики Беларусь об образовании: с изм. и доп. по состоянию на 21 сент. 2016 г. – Минск : Нац. центр. правовой информ. Респ. Беларусь, 2016. – 400 с.

3. *Седова Е. Е.* Аксиологические основы «педагогики культуры» С. И. Гессена как пути выхода из культурного кризиса эпохи // Философско-педагогическая концепция С. И. Гессена: Монография [Электронный ресурс]. URL: http://www.bim-bad.ru/biblioteka/article_full.php?aid=214 (дата обращения: 20.03.2021).

4. *Тарасова Н. В., Кулаков А. Е.* Современные тенденции мировой образовательной системы Школьные технологии. 2015. № 1. С. 3–12.

5. Росийская музейная энциклопедия. Словарь музейных терминов [Электронный ресурс]. URL:http://museum.ru/rme/dictionary.asp?40 (дата обращения: 20.03.2021).

6. *Фёдоров Н. Ф.* Музей, его смысл и назначение // Музейное дело и охрана памятников. – М. : Российская государственная библиотека, 1992. С. 3–14.

7. *Столяров Б. А.* Музейная педагогика. История, теория, практика: учеб. пособие. М. : Высш. шк., 2004.